А. Платнер

# Соль жыцця



А. Платнер

# СОЛЬ ЖЫЦЦЯ

Пераклад з яўрэйскай мовы

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
МІНСК 1957

*Прысвячаю Дэборы*



## СОЛЬ ЖЫЦЦЯ

Не, любая, рана
Шукаць забыцця.
А бель галавы —
Гэта соль, соль жыцця,
Што хлебу жыццёваму
Смак надае,
А хвалі на моры —
Магутнасць яе.
Без смутку-ж няма
Весялосці нідзе,
Бо цень-жа за сонцам
Спрадвеку ідзе.
А ведаеш, горкія
Слёзы чаму?
Не выплачаш іх —
Дык і цяжка таму.
А выплачаш — стане
Святлей і лягчэй,
І вочы вільготныя —
Шмат прыгажэй.
Не, рана аб старасці

Нам гаварыць.
Глядзі, увесь горад
Світаннем гарыць.
Дзень творчае працы
Пачаўся вакол,
Дыханнем магутным
Калышучы дол.
У вокнах ад сонца
Аж плавіцца шкло,
І тысячы кветак
На іх расцвіло.
І верш мой, і дом,
Што будуецца нам,
Усё застанецца
Наступным вякам.
Жыццё — гэта ўсё,
Што вакол і з табой:
Вясёласць, і смутак,
І твой непакой,
І сонца, і дрэвы,
І радасць быцця,
І бель галавы —
Гэта соль, соль жыцця.
Ты кажаш, маршчынкі, —
Прайшла маладосць...
Ну што-ж, наша часць
Ва ўсім зробленым ёсць.
А сівыя скроні?..
Я рад іх любіць!
Мінулага свет
Пад нагамі ляжыць.
А новым праспектам,
Што сонцам услан,
Імчыцца дзіця наша,

Быццам-бы лань.
Сустрэне таго,
Каго стане любіць,
І песня далей
На зямлі прагучыць.

## КРЫНІЦА

Калі хто захоча напіцца вады, —
Калодзеж капае глыбокі...
Калодзеж я ў сэрцы капаў праз гады,
Знайшоў там кахання вытокі.

Жыццё, быццам кнігу, раскрыў і гляджу:
Там з радасцю гора сплялося.
Падобна да кропель вясновых дажджоў
Каханне блішчаць засталося.

Зямлю я шчаслівую прагнуў знайсці
(Дзіцячых гадоў хваляванні),
Не меў я нічога, а толькі у жыцці
Валодаў адзіным—каханнем.

Не радаснай тая часіна была,
Дзень поснай суботы у хаце.
І з плачам, за лішнюю крошку з стала,
Шчыпала гаротная маці.

Я ў сэрцы каханне тады захаваў,
Каб нават не ведалі людзі.
І штодзень вялікага прыйсця чакаў
І верыў — яно яшчэ будзе.

Мінула і знікла гадоў чарада,
Мужнеў я і сіл набіраўся.
Цяжкая, цярністая тая хада
Была, каб назад не вяртаўся.

На хвалях жыццёвых у змроку начы
Я сцежак жыццёвых не зблытаў.
Даплыўшы да шчасных сваіх далячынь,
На бераг ступаю адкрыты.

Натхнёны каханнем мой спеў не маўчыць,
Сустрэўшы жыццёвы свой поўдзень;
Ён, мне асвятляючы цемень начы,
Праз нетры глыбінныя пройдзе.

Здаралася, праўда, спыняўся мой спеў,
Разбітая скрыпка змаўкала.
Але-ж захаваць я каханне хацеў,
Яно ратавала, натхняла.

Як радасна мне, што каханне было,
Як сонца,— нідзе не ржавела,
Мяне гартавала, наперад вяло
Заўсёды надзейна і смела.

Пайду па жыццю і, як той багацей,
Кладовішча чулага сэрца
Я шчодра раскрыю на радасць людзей—
Для іх яно песенна б'ецца.

Калі хто захоча напіцца вады, —
Калодзеж капае глыбокі...
Крыніцу я ў сэрцы капаў праз гады,
Знайшоў там кахання вытокі.

*1956*

## У ДАРОЗЕ

Зямля мая! Слаўная наша краіна!..
Ў ружовых світаннях—дымкі цягнікоў...
Я рады, што заўжды завеш мяне сынам,
Што еду па родных абшарах дамоў.

Мяне сустракаеш ласкаваю гэткай,
Быў верным табе я заўжды і ва ўсім.
Хай вецер далёкі мне будзе за сведку:
У сэрцы любоў да цябе я насіў.

Дзень добры, айчына мая дарагая!
У міры і ў шчасці заўсёды квітней...
Я родную мову пачуў свайго краю,
Убачыў пагляды зычлівых вачэй.

Хвала тваім травам, вільготным ад росаў,
Да іх прыхінешся — лягчэе цяжар...
Табе я пад вечар свой смутак прыносіў,
Каб пот асушыла, авеяла твар.

Мільгаюць масты... Семафоры маячаць...
Агні пазіраюць, як вочы, услед...

Бы ў казцы забытае кніжкі дзіцячай,
Знікае зімовы аснежаны свет.

Праносяцца вёрсты... А іскры, як пырскі,
Ляцяць ў наваколле... Імчыцца цягнік...
Сустрэча ўжо блізка!
Сустрэча ўжо блізка!
І знікла адлегласць, і час ужо знік.

## МАЯ ЎРАЧЫСТАСЦЬ

Старыя дарожныя боты
Яшчэ не паспеў я змяніць,
І дзень мне здаецца каротак,
І ноч не дае цішыні.

Гляджу я, раскрыўшы павекі,
На ўзоры дзівоснай разьбы,
Як быццам я роўна поўвека
На вуліцы роднай не быў!

Куды я свой позірк ні кіну, —
Усюды адбітак падзей,
Шле час, што ні крок, мне навіны,
Ён сам, што ні дзень, маладзей.

Здаецца, нядаўнюю ростань
Прайшоў я абрывам крутым,
А ўжо не дагнаць тыя вёрсты
Нагам пастарэлым маім.

Насустрач імчацца машыны,
Вітаюць сябры на хаду.
Сваю без памылкі мясціну
Я ў руху жыццёвым знайду!

Іду я, бадзёры, вясёлы,
Схаваць не магу пачуцця,
І колеры дзіўных вясёлак
У зрэнках маіх зіхацяць.

А лета пануе ўрачыста,
Над пышнымі кронамі дрэў
У небе празрыстым і чыстым
Апошні прамень дагарэў.

*1956*

## У РАІ

На сонечнай вуліцы, сцежцы сухой,
Вясеннія песні гучалі,
Дзяўчынкі скакалі на ножцы адной —
У «класы» яны тут гулялі.

Напэўна глыбока задумаўся я,
Што нават і сам не прыкмеціў,
Што ўжо на сярэдзіне «рая» [1] стаяў, —
Навокал смяяліся дзеці.

Я сённячы з імі у гульні гуляў,
Забыўшы пра розныя ўзросты,
Скакаў на назе, жартаваў і спяваў, —
Было ўсё так добра і проста.

І думкі, што ўсюды хадзілі за мной,
Цяпер адляцелі далёка.
У гульнях дзіцячых знайшоў я спакой,
І радасна стала навокал.

---

[1] «Рай» — гэта адна клетка ў дзіцячай гульні ў «класы».

Мяне не прагналі з гульні малышы,
Хоць класы я ўсе пераблытаў.
Наш рай на зямлі — то багацце душы
У дружбе сяброўскай адкрытай.

Якою-б дарогай жыццё ні вяло —
Я з вернага курсу не збіўся.
Цяпер прада мною любоў і святло,
Цяпер я ў раі апыніўся.

*1956*

## У ЛЕСЕ Ў ПАЧАТКУ ВЯСНЫ

Вясна, і павольна вылазіць ялінка
З-пад снегу, нібы птушанё.
Асмяглымі пальцамі ў снезе галінкі
Сабе прарабляюць акно.

Прыгожыя сосны шумяць паўз дарогі
Па пояс у снезе. Цяпер без панчох
Пад сонца падставілі зграбныя ногі,
Ступенямі стаўшы на мох.

Нядоўга ўжо снегу ляжаць—ён растане,
А зараз сінее і чэзне штодзень.
Ён заўтра паводкай вясноваю стане,
І след яго брудны закрэсліць прамень.

А птушкі здалёку дамоў прыляцелі,
І пырхаюць парамі ў лесе яны,
І ў гнёзды пуховыя сцелюць пасцелі,
І грэюцца ў промнях ласкавай вясны.

Сюды я прыйшоў для вялікай сустрэчы,
Мяркую вытокі кахання знайсці.
І сум адляцеў мой, бо ён недарэчы
На сцежках квяцістых у светлым жыцці.

І першага дожджыку прагнуць сасонкі,
Іх волкае голле на ветры дрыжыць.
Усё тут замоўкла — не чутна гамонкі,
Зямля, як цяжарная, ў стоме ляжыць.

Без шапкі між дрэў я стаю ў задуменні,
Падставіўшы лоб свой пад свежы павеў.
Пяшчотна яго абдымаюць праменні,
І новы ў душы нараджаецца спеў.

А сонца аж слепіць. Раз'ятраным жарам
Зямлю ахінае і лес залаціць,
Аж покуль сустрэне дажджовую хмару,
Маланка заззяе, і гром загрыміць.

На кожным пагорку, маленькай лагчыне,
На ўзлессі і шыры бязмежных палёў
Жыццё навальніцай вясенняю хлыне, —
І ўсё заквітнее, адновіцца зноў.

*1956*

## НЯСКОНЧАНЫ АЎТАПАРТРЭТ

Прамінула ужо
Шэсць дзесяткаў гадоў,
Калі з горкай слязой
У жыццё я прыйшоў.

Я адно тады ўмеў —
Піў у маці з грудзей,
Я не ведаў, што хлеб
Пахне потам людзей.

Вось я трохі падрос,
Бачу многа дарог.
Толькі ў людзі ніяк
Па іх выйсці не мог.

Бацька дзягаю б'е,
Маці словам пячэ...
Так паказваўся свет
Для дзіцячых вачэй.

І падзелена ўсё
Не пароўну было:

Аднаму толькі змрок,
А другому — святло.

*

Свет стары запалаў,
І я з дому пайшоў,
Праз агонь барацьбы
Шлях да шчасця знайшоў.

Стала ўсё дагары —
Быццам смерч над зямлёй,
Але-ж лёгка хадзіць
Простым людзям па ёй.

Сонца выйшла ў прастор,
Так заззяла тады,
Што цяпло і святло
Я прыдбаў назаўжды.

Маю многа сяброў
І сяброўку спаткаў,
І жыццё збудаваў,
І дзіця ўзгадаваў.

Час нічога не сцёр,
Не сатрэ, каб хацеў,
Ён са мною жыве,
Хоць даўно адляцеў.

*

Хоць даўно я пішу,
Маю імя — паэт,
Дапісаць не магу
Я свой аўтапартрэт.

Я навокал зірну:
Колькі трэба сказаць!
Каб управіцца, зноў
Дзіцянём трэба стаць.

Кожны дзень, кожны міг
Новых спраў настаццё,
Кожны дзень я наноў
Пачынаю жыццё.

Час павінен чакаць,
Часу шмат у яго.
Вельмі-ж многа работ
У мяне аднаго.

Што паспею — зраблю,
Дзе прайду — кіну след.
З гэтых рысаў складзецца
Мой аўтапартрэт.

*1956*

## ДРУЖБА

Сяброўскія рукі ў цяжкую хвіліну
Надзею акрыляць, узнімуць твой дух.
А ласкавы погляд вачэй — ён адзіны
Падкажа табе: вось твой сябар і друг.

Прыгожая рыса, як дар пакаленняў,
Руку падаваць і казаць: добры дзень!
Вось гэтак вітаўся вялікі наш Ленін,
І ўспыхваў зычлівае ўсмешкі прамень.

Былі па-вясенняму цёплыя словы,
Калі па-сяброўску ён друга вітаў.
Ён шчырасць глыбокай сардэчнай размовы
У спадчыну рускім людзям перадаў.

Братэрскаю дружбай народы сагрэты
Па-ленінску, ў цесным сяброўстве сваім.
Як сонца, яна зіхаціць над сусветам,
Шляхі ў комунізм пракладаючы ім.

## ЧАЛАВЕЧАЕ СЛОВА

Да плыўца ў акіян светлым птахам з зямлі
Далятае сяброўскае слова,
І цяплей на душы, хоць цябе абнялі
Хваляў шум, подых шторма суровы.

Паміж небам і морам—на стыку двух сіл —
Чалавек, як расінка ў пустыні,
Перад тварам дзівоснай і грознай красы
Над бяздоннем зялёных глыбіняў.

Родны бераг далёка... Здаецца, цябе
Пакідае надзея на шчасце.
Б'юць халодныя хвалі у твой карабель,
Свішча вецер, зрываючы снасці...

У хвіліну адчаю прыходзіць тады
Голас родны сяброўскага слова,
Каб цябе зберагчы ад нягод, ад бяды,
Каб напоўніць душу сілай новай.

Голас друга адолее час і прасцяг,
Гул навалы, бязмежныя шыры,
Нібы словам, абвеяным праўдай жыцця,
Твой народ прывітаў цябе шчыра.

## БАБІНА ЛЕТА

Асенняе сонца пяшчотна пячэ,
Ў восень — лагоднае сонца яшчэ,

Нібыта кабеты пяшчотнай любоў,
Так цёплае сонца распальвае кроў.

Яно садавіну кашамі нясе,
І просіць: вазьміце, каштуйце усе.

Кавалачкі яблык хрумсцяць на зубах, —
Праменнаю фарбай набраклі ў садах.

Пахучыя грушы і яблык янтар,
І сінія слівы — вось сонечны дар.

У сціртах капуста, гарой гарбузы —
Трашчаць пад цяжарам на рынку вазы.

У шоўкавых хмарках праменіцца даль,
Ляціць павуціння празрысты паркаль.

Звініць пазалотай і ясень, і клён;
Як я, гэтым сонцам захоплены ён.

Яно-ж закалыхвае водарам траў.
Я гэтае сонца ізноў пакахаў.

*Верасень — кастрычнік 1956*

## ГЕРОЯМ ПАЎСТАННЯ ВАРШАЎСКАГА ГЕТА

Чым рана старэй, тым балючай яна.
Чым крыўда глыбей, тым нянавісць мацней;
Кроў наша бушуе, ды не ад віна,
Ад гора, якое кінжала вастрэй.
Што словы спагады? Не вернуць яны
Ахвяр, што аддалі народа сыны!

Я спаць не магу. Пакідаю пакой,
І дзверы і вокны бягу расчыніць.
Мне душна, мне цесна пад важкай страхой,
І сцены ламлю я нямых камяніц!
Іх многа — не хопіць ім месца і тут!
Мяне успаміны былога гнятуць,
Загінуўшых кроў асляпляе мне зрок,
Мне стукае ў сэрца апошні іх крок!

Я чую ў іх голасе грукат грымот
І заклік да ўсіх, хто жыве на зямлі,—
То голас бацькоў, і братоў, і сірот,
Што ў баіцы няроўнай касцямі ляглі.

Дарогай бясстрашных у вечнасць ідуць
І чумную топчуць нагамі брыду.

Я чую ў іх голасе словы адны:
Даволі забойства, крыві і вайны!

*1956*

## ПЕСНЯ РАДАСЦІ

Па-над берагам Нёмана ціша плыве,
Ходзіць статак па роснай зялёнай траве,
Лес магутны пільнуе дрымотны спакой, —
Толькі хвалі няспыннай бягуць чарадой,
Нібы час, што не вернеш ніколі назад!
Зіхаціць і плюскоча пад сонцам рака,
Гэта — рух, гэта ўперад прасцёрта рука.
Можа й ёсць гэты рух, гэты пенны каскад
Найвышэйшага шчасця людскога сабрат?
Не шукае рака ні спакою, ні сна —
І шуміць, і бяжыць, і гамоніць яна,
І нясе на срабрыстых сваіх грабянцах
Бег гадзін, бег хвілін без канца, без канца...
Я дыханнем жывых навальніц напаю
Сваё сэрца і гэтую песню сваю:
Я? Магу я ў звычайнасць гаворкі людской
Кінуць голас хвалюючы, песенны, свой.
Я іду — гэта крок мой цалуе зямлю.
Я пяю — гэта я ўсё жывое люблю.
Я жыву — гэту радасць шточасна, штодзень
Носіць мой неразлучны, уласны мой цень.
Жывавай хвалі шпарчэй зыркі погляд вачэй,

Бліскавіц агнявых мая думка ярчэй.
Я? Магу я паводак разлівы спыніць,
Я магу між сабою дзве рэчкі злучыць,
Я магу ўтаймаваць іх бурлівую плынь,
Я магу іх узняць вышынёю плацін, —
Каб на месцы тых рэк — мора сіні прастор
Калыхаўся, асветлены полымем зор;
І каб там, дзе пустэльні ляжаць без граніц,
Хваляваліся нівы разлівам пшаніц.
Па-над берагам Нёмана ціша плыве,
Ходзіць статак па роснай зялёнай траве,
Лес магутны пільнуе дрымотны спакой, —
Толькі хвалі імчацца дарогай сваёй,
Нібы час, што ніколі не вернеш назад! —
З імі я, з імі шчасця майго далягляд!

*1956*

## КАМЕННЕ МАЕЙ ВУЛІЦЫ

Нямала пабачыла дзей і здарэнняў
На вуліцы роднай нямое каменне.

Нямое нямым застаецца заўсёды
І сцерпіць маўкліва бяду і нягоды.

Ліхія гадзіны над ім пралятали.
У рукі не раз і не два яго бралі,

Ім ворага білі, пабраўшы, як зброю,
На смерць з ім ішлі барыкадаў героі.

Старое каменне, ты многа спазнала:
І подыхі буры, і посвіст навалы!

Ляжыш нерухомай халоднай цвярдыняй,
Пабітае громам, абмытае ліўнем.

Ішлі па табе закаханыя пары,
Ішлі пераможцы, грымелі фанфары.

Упарта, каменне, маўчыш, як магіла,—
Цябе гаварыць не прымусіш і сілай.

Няхай ты сягоння пакрыўджаным будзеш,
Ды зломяць упартасць упартыя людзі.

Прыйдуць, раскапаюць, каб некуды звесці
Для новае вуліцы ў новае месца.

Прабач, цябе заўтра заменяць асфальтам,
Ты ўпартае — час яшчэ болей упарты!

Яшчэ паслужы, бо на звалку зарана,—
Аздобіш ты бераг ракі ўтаймаванай.

Для новых часін, для вялікай будовы
Ты ляжаш надзейнай і цвёрдай асновай!

## ПАМЯЦІ КОМСАМОЛЬЦА

Здавалася, сонца замала,
Здавалася, мала святла:
Юнацтва свой шлях пачынала,
А сталасць яшчэ не прыйшла.

Агонь разліваўся па жылах,
У мускулах дужасць расла,
Твая неўтаймоўная сіла
Па хвалях жыццёвых ішла.

Прыгожым было каханне,
Што сэрцы злучыла двух,
Цяжкім было развітанне
З табою, таварыш і друг!

Прыходу твайго чакалі
Твае гарады і палі.
Ты рэк пераплыў нямала,
Ты мораў нямала праплыў.

Усюды — на ўсход і на захад
Дарогі твае пралеглі.
Хадзіла юнацтва без страху
Па родных прасторах зямлі.

Ты браў перашкоды з бою,
Ты йшоў без хістанняў наўпрост,
Свой лёс ты звязаў з барацьбою,
Аддаўшы сваю маладосць.

Глядзеў ты з акопа на зоры,
На ззянне далёкіх планет,
І мара па сінім prасторы
За імі імкнулася ўслед.

Сардэчную матчыну ласку,
Вясёлы бацькоўскі жарт
Не чуў ты. Прабітую каску
Стачыла на полі іржа.

А лета ўздыхае прыпарам,
І водар струменіцца з дрэў,
Шчаслівая юная пара
Цалуецца каля дзвярэй.

Старэнькая ціхая маці,
Праплакаўшы вочы даўно,
Самотная ходзіць па хаце,
Штодня паглядае ў акно.

На ганак пахілены выйдзе,
Глядзіць у няўцешнай журбе,
Даўно на цябе яна ў крыўдзе,
Што вестку не шлеш аб сабе.

Не знала, што куля скасіла
Любімага сына яе,—
Яна-б да грудзей прытуліла,
Суцішыла-б мукі твае.

Маўклівыя, сціснуўшы зубы,
Сябры твае неслі цябе.
У гаі пад спаленым дубам
Знайшоў ты магілу сабе.

Хай вораг зламаў твае крылле
У росквіце гордых надзей,
Юнацтва-ж гарачая сіла
Наперад нястрымна ідзе.

І шчодра гарачае сонца
Адорвае землі святлом
У руху няспынным, бясконцым
Над тым, што жыве і жыло!

## СВІТАННЕ

Румяна неба з краю і да краю,
Зара павольна гасне за зарой.
І першы чалавек, каго страчаю,
Нясе любоў і цеплыню з сабой.

Ідзем сумесна дню мы насустрэчу,
Мы разразаем вецер з ім наўзмах.
Пяшчотнасць маці мне лягла на плечы,
Спакой дзіцяці свеціцца ў вачах.

Бразгочуць дзверы. Дахі на будынках
Плывуць да сонца, распластаўшы цень.
Цяпер мне шкода страціць і хвілінку:
З усімі разам я ступаю ў дзень.

Прыемна несці важкасць бытавання,
І працу дня, і ўсіх начэй красу.
Праз сінія празрыстыя світанні
Сваёй краіне я жыццё нясу.

*1940*

## ЖЫЦЦЁ МАЁ

Хаджу я закаханы ля цябе,
Гляджу у твар табе, у вочы міла,
Каб ні адна хмурынка чысціні
Красы тваёй не засланіла.

Жыццё маё, глядзі — прыйшла вясна,
Прыйшла на ганак наш і ў наваколле.
Я пад руку вазьму цябе, жыццё,
І пойдзем мы гуляць у поле.

Высока неба ў нас над галавой.
Зіхцяць палеткі збажыною росна.
Глядзі, як рана сонейка ўстае
І ўвечары заходзіць позна.

На досвітку услаўлю ноч з табой,
Увечар будзе дзень апеты.
Жыццё маё, цудоўна будзе нам,
Паверыць можаш мне у гэтым!

Каровы павыходзілі з хлява,
Конь развявае грыву залатую.
Я для цябе ні хлеба, ні святла,
Ні любасці не пашкадую.

Усёй краіны шыр і даўжыню
З табою праляцець, жыццё, бяруся.
Па ранішняй расе я выйду ў шлях,
Праз свежыя дажджы памчуся.

Калі мы стомімся пасля паўдня,
Калі паліць нас будуць лёсу спёкі,
У засені, каб асвяжыць душу,
Пад дрэвам спынімся высокім.

Калі-ж сустрэнем мы сваіх байцоў,
Узняўшы рукі, ля дарогі станем,
Каб шчыра, ад душы, нам зноў і зноў
Ушанаваць іх прывітаннем.

Я не ступлю, пакуль не правяду
Апошняга ў калоне верхавога.
— З вясной цябе, мой родны край! — скажу
І рушуся далей дарогай.

*1940*

## КАЛІ ЛАСКА

**(Вольны пераклад)**

Тры гады я не маю спакою ні звання,
Тры гады як блукае за мною расстанне,
Адзначаю сягоння я смутную дату —
Дзень, калі пакідаў сваю родную хату.
А наўкол разліваецца спелае лета,
Каласамі шуміць урадлівы палетак,
Зацвіло на ім неба валошкаю сіняй,
Як і ў нашай далёкай-далёкай краіне.
Людзі йдуць, і са мною спыняецца кожны,
І я ў кожным найлепшага сябра знаходжу,
А туга не змяншаецца нават на волас,
Хоць на тысячу дзён пасталеў яе голас.
Часта-часта, здараецца, зойдзе размова,
У мяне вырываецца роднае слова:
— Калі ласка! — прамоўлю, а сябра адчуе.
Дзе з парога вітаюць:
— Заходзь, калі ласка!
Дзе за стол запрашаюць:
— Сядай, калі ласка!
Дзе руку паціскаюць:
— Прыходзь, калі ласка.

І я маю салодкім сваім абавязкам
Гаварыць, паўтараць без канца: — Калі ласка!
Найсвятлейшае слова між слоў Беларусі!
Я з табою жыву і дадому вярнуся,
І тады толькі сціхне у сэрцы трывога,
Калі сам запрашу я гасцей ад парога:
—Калі ласка!

*1944*

## ПЕСНЯ ПРА МІНСК

Не буду пытацца ні ў кога,
І болей ніхто ўжо не скажа,
Сама будзе весці дарога
Туды, куды думка падкажа.

Там пляц мяне кожны пазнае,
І камень раскажа мне з бруку,
І комін з руін нагадае
Няўтойную рану і муку.

Звяры павяртаюць у норы,
А птушкі — да гнёздаў любімых.
Магіламі ўкрыты прасторы,
Ды нельга забыцца радзімы.

Хай ластаўцы нельга мясціны
Знайсці, дзе гняздо змайстравана,
А я адшукаю руіны,—
Тут хата мая зруйнавана.

Праз камень трава прарастае,
Галінка да сонца імкнецца,
Ізноўку зямля зацвітае
На попеле спаленых сэрцаў.

Як птушка малая, старанна
Свой дом адбудую нанова,
Да стомы, да поту я стану
Цагліны насіць на будову.

Каб там, дзе браты паміралі,
Дзе іхняя кроў чырванела,
Ні колер, ні гук не прапалі. —
Каб зноўку жыццё заквітнела!

*1945*

## ДА МУЗЫКІ

Сыграй мне, музыка, сыграй мне без нотаў,
Без флейты,без скрыпкі сыграй,
Сыграй на кавалках парванага дроту,
Што звіс на слупах з краю ў край.

Хадзіць па дварах і па вуліцах будзем,
Хай скрозь нашы песні гучаць.
Збягуцца да нас уцалелыя людзі.
Мы будзем між імі стаяць.

Не, цяжка забыцца, забыцца не можна,
Галосіць пралітая кроў...
Сам-на-сам дзе-небудзь тады асцярожна
Паплачам маўкліва, без слоў.

Сыграй-жа мне гнеўную песню, музыка,
У гневе мой смутак сплыве.
Тут знішчан дазвання набытак вялікі,
Але перамога жыве!

Па вуліцах нашых праходзіць дарога,
Дарога на захад вядзе.

Насустрач сваім пераможцам з парога
  З уцехай выходзім штодзень.

Сыграй-жа, музыка, сыграй мне без нотаў,
  Матыў перамогі сыграй,
Сыграй на кавалках парванага дроту,
  Што звіс на слупах з краю ў край.

*1944*

## ПЕВЕНЬ НА МАЕЙ ВУЛІЦЫ

(Замалёўка)

Відаць, што нядрэнная памяць у пеўня, —
Заплюшчыўшы вочы пяе.
Успомніў, што некалі жыў ён, напэўна,
Паблізу ад хаты мае.

Вясны залацістае ранак пагодны,
Чароды курэй маладых,
Двароў ён шукае знаёмых і родных,
І цяжка яму ад нуды.

Ідзе, галаву на бакі паварчае,
Мясціны нібы пазнае.
І вуліца так, як даўней, выглядае,
Ды нечага ўсё-ж не стае.

Вось ганак, прыступка, парог... Ды нікога,
Хто-б дзверы яму адчыніў.
А тут-жа дзяцей было некалі многа!
Няўжо ён як-небудзь зблудзіў?

На цэглу, на лом ён ступае няцвёрда,
Ён крыллі свае распрастаў...
Расцвіў яго грэбень... і раптам ён горда
Узняў галаву й заспяваў.

*1944*

## ЗЯЛЁНЫ ЛІСТ

Глянь на дрэва,— на галлі
Першы ліст зазелянеў!
Крона спалена калісь,
Але корань уцалеў.

Што за зімы тут былі,
Што за леты — не сказаць!..
Маці-б хоць прыйшла калі
Дзіцянё закалыхаць.

Хоць-бы зрэдку верабей
У лісці пашчабятаў.
Хоць-бы голас весялей
Час-ад-часу залунаў.

Ствол, распранены зусім,
Засаромлена глядзіць;
Выйшаў ён з агню такім, —
Без кашулі, як стаіць.

Многа часу ён чакаў —
Пасівелы, моцны ствол.
Верх ягоны засыхаў,
Ды жывіў карэнні дол.

І цяпер усім відаць:
Пачынае дрэва жыць.
Гулка вуліцы звіняць,
Вецер радасна шуміць.

Першы ліст зазелянеў,
Самы свежы між лістоў.
Корань дрэва уцалеў, —
Адрасце і верх ізноў!

*1945*

# ЖНІВО

Збіраецца маці, бярэ яна серп:
Даўно асыпаецца спелы загон.
Ідзе на палетак і ў сэрцы нясе
Нямецкім забойцам гарачы праклён.

І жала яна і вязала снапы,
Ўвесь дзень ваявала да позняй начы.
І грозна звінелі на нівах сярпы,
Мільгалі ў паветры сярпы, як мячы.

Бліскучыя росы на травах, як пот,
Паціху дамоў адыходзяць жанцы.
Дзяўчаты! Вы бачылі сонца заход?
Там здужалі ворага нашы байцы!

Смяюцца дзяўчаты. Чаму ім не знаць?
Бо тыя-ж байцы — гэта іх жаніхі.
Ноч стала лугі у туман апранаць,
На раніцу будзе яснейшы блакіт.

На ранні увішней пачнецца жніво,
Аб гэтым дзяўчаты на прызбах пяюць,
І песня звініць маладым хараством,
А маці ўсё думае думу сваю.

Яна ўспамінае далёкіх сыноў, —
На фронце яны, затужыла па іх.
Калі-ж дачакаецца маці дамоў,
Сустрэне, абдыме гасцей дарагіх?

Яна абвясціла таксама вайну, —
Сынам памагае на полі сярпом:
Збірае і вяжа ў снапы збажыну
І ворага душыць жытнёвым вязьмом.

*1942*

## СТУДЗЕНЬ

Марозны студзень стаў каля акна.
З франтоў прыходзяць добрыя навіны.
Здаецца мне, радзіма ўся відна
У гэтую вячорную гадзіну.

Гарыць агонь, цудоўны чорны хлеб
Дае мне сіл для заўтрашняе працы.
Я выйду рана, толькі у імгле
Пачне маленькі горад прачынацца.

Так, дзень пры дні, у гэты самы час,
Нібы па змове ці па абяцанню,
Я на рагу страчаю скрыпача,
Мы разам з ім праходзім на світанні.

І радасна мы паўтараем зноў,
Што уначы быў адагнаны вораг,
І слаўная сям'я савецкіх гарадоў
Пабольшала яшчэ на вызвалены горад,

Мы прывітаем дзень: я — словам, ён — смыком,
Спеў паляціць у дальнюю дарогу.
Няхай-жа ён сустрэнецца з байцом,
Што пачынае дзень наш перамогай!

*1942*

## ДОЖДЖ

—А што ты мне, бацька, сягоння прынёс?
Што там выглядае ў цябе з-пад рукі?
—Ці ў свеце ласункі смачнейшыя ёсць,
Як свежы хлябок з пытляванай мукі?

У сілу ўбіраецца летняя ноч,
Паціху ахутваюць хмары зямлю.
Дзіця не кладзецца, чакае яно,
Што зараз абвешчаны будзе салют.

Забыла дзіця, што вячэраць пара, —
Пакроен на лусты ляжыць каравай.
І праўда, чутно: загулі ў рупарах
Знаёмыя словы: «Гаворыць Масква!»

Вось дождж сыпануў і пабег у прасцяг,
Праліўся у полі, вярнуўся назад,
А сон падышоў і загойдаў дзіця,
І светлую казку яму расказаў.

А дзесьці наперад памкнуўся баец,
Асвежаны добрым і цёплым дажджом,
Ізноў зарадзіў ён гарматы свае,
І ворага ўдарыў знішчаючы гром.

*1943*

## КРАВЕЦ

Нямнога жадаў гэты просты кравец:
Каб хлеб на стале аздабляў яго дом,
Каб зоры раслі, як суніцы ў траве,
Здаволен быў працай сваёй і жыццём.

Часамі, у свята, хадзіў ён гуляць,
Глядзеў, як рунее суседаў загон,
З зялёнага лесу прыносіў галля
І столь прыбіраў, як вялося здавён.

І слова сказаць, і адзежу пашыць —
Стараўся рабіць для суседзей найлепш.
Сяляне любілі краўца ад душы,
Салодкі яму быў зароблены хлеб.

А немец прыйшоў і хаціну спаліў
І поле суседава ўшчэнт здратаваў.
Гаркотаю дым да нябёс зачадзіў,
І сумна панікла ў далінах трава.

Ляжыць на руінах забіты яўрэй, —
З усёю сям'ёю загінуў кравец, —
І толькі дзіця ад нялюдскіх вачэй
Суседзі ўтаілі, схавалі ў хляве.

Як ноч узышла на затлёны прасцяг,
У хлеў адчыніліся дзверы крадком,
Суседка прыйшла паглядзець на дзіця,
Даць хлеба крыху, напаіць малаком.

З жанчыны яно не спускае вачэй,
Да хлеба працягвае ручкі свае...
Не можа малое уцяміць яшчэ,
Чаму гэты хлеб не матуля дае.

На грудзі цяжкая слязіна сплыла...
Сядзела жанчына з малым да відна,
На рукі ўзяла, у свой дом занясла,
І маці яму замяніла яна.

*1943*

## ПАМЯЦІ ЭЛІ КАГАНА

Ты болей не прыйдзеш
Да нашых дзвярэй,
І вечар мой будзе
Паперы бялей,—

Нічога я з гора
На ёй не ўпісаў,
Бо словы, як птушак,
Віхор разагнаў.

Да птушкі падобна
Маё пачуццё.
...Наш дом — у пажары,
У доме — дзіцё.

А мне не ўзабрацца
На вогненны дах...
Так вобраз прыходзіць
Мне твой па начах.

Ты болей не прыйдзеш
Як госць да мяне.
Стаіць толькі месяц
Халодны ў акне.

Твой твар праплывае
У бляску, без дум...
Як птушка пад ветрам
Лятае твой сум.

І падаюць птушкі
На вогненны дах...
Так вобраз прыходзіць
Мне твой па начах.

*

І раптам знікаюць цяжары,
З'яўляецца радасць у дом, —
У хату заходзіць таварыш,
Становіцца светла кругом.

Пыл боты яго пакрывае,
На твары суровы выраз.
У вочы яму пазіраеш,
Мінулы прыгадваеш час.

— Дзень добры! — ён кажа. І ранак
Адразу святлее вакол.
І ўсё, што на сэрцы схавана,
Кладзеш перад ім, як на стол.

Размова, пачатая сціпла,
Праз момант ліецца ракой.
І ноч ужо к вокнам прыліпла.
А друг твой, таварыш — з табой.

Нам трэба сказаць гэтак многа,
А мы не сказалі ані.
Мы хочам унікнуць былога,
Зірнуць у наступныя дні.

Гадзіна ідзе за гадзінай,
І часу губляецца след.
Мы ўдвух з сваім другам адзіным,
І з намі цяпер увесь свет.

*1944*

## НЕ СПАГАДАЙ

Не спагадай, што у мяне
Сівая галава!
Я русым быў, я сівізну
Нялёгка здабываў.
Я многа бачыў,
Знаю шмат,
І ты скажы мне,
Дай загад, —
І песню я табе спяю
Аб тым, хто маладосць абараніў тваю,
Хто бачыў смерць, пакуты след,
Хто увайшоў цяпер у новы ясны свет.

Не спагадай!
Зірні, — яна,
Мая празрыста сівізна,
І вочы ясныя мае,
І зубы цэлыя мае;
Ім хлеб ласункам быў у юныя гады,
А ўмелі мне язык не адкусіць тады,
Калі мой апетыт быў вельмі малады.

Аднойчы я ўначы цябе чакаў,
Ў далёкім горадзе завулкамі блукаў,
У белае начы быў вельмі сіні снег,
Я гаварыў табе, што мала меў уцех
У маладосці.

Рэха паміж гор

Падладжвалася ў такт да голасу майго.
Тады пачуў адказ я ў цішыні начной:
«Вялікае жыццё ляжыць перад табой!»
І з гораду, што спаў паміж далін,
Мы на гару высокую ўзышлі,
Тваю руку знайшла мая рука,
І пахла яблыкам твая халодная шчака.

*1940*

## ПРАЦАВАЎ ЦАЛЮТКІ ДЗЕНЬ Я...

Працаваў цалюткі дзень я
І цябе чакаў.
Сіні вечар лёг на сцены,
Выйшлі мы — ў руцэ рука.

Ў задумёным сонным полі
Любіш ты хадзіць.
Вось зрываеш спелы колас
І глядзіш на маладзік.

Ў полі жыта даспявае,—
Хутка і жніво.
Чуеш, сэрца як спявае,
Услаўляе хараство?

Мы ідзем так доўга моўчкі,
Толькі ў грудзях спеў.
Бачыш, яблыкі, як вочы,
Выглядаюць з сонных дрэў?

Вось наскочыў шустры вецер,
Яблыка зваліў,
Шаль твой ўверх і ўніз ён верціць
Між разгойданых галін;

І здаецца, ты ўзляцела...
Не! Спыніла ўзлёт...
Воблік твой з усмешкай смелай
Мне ў душу глыбока лёг.

І сама ўся ў летнім цвеце
З кудрамі вясны.
Пекната іх ўночы свеціць,
Круглы год цвітуць яны.

Ўвесь рабочы дзень насіў я
Вобраз залаты.
Скора прыйдзе вечар сіні...
Не марудзь, прыйдзі!

*1940*

## ЗІРНІ, ДЗІЦЯ!

Зірні, дзіця!
Апала з дрэў краса...
А помніш, як стаяў у белым цвеце сад,
Як ён шумеў,
Гайдаў птушыны спеў,
Як тупалі дажджы між дрэў?
Зірні, дзіця!
Табе вясны шкада,
Ліпнёвым дням яе
Не хочаш ты аддаць,
Не хочаш знаць,
Што лета надышло
І з той красы у садзе вырас плод.

Зірні, дзіця!
Прыйшоў асенні дзень.
Асенні дождж па вуліцах ідзе,
А ты у бесклапотнасці сваёй
Яшчэ жывеш тым летам і вясной:
І дрэвы у цябе цвітуць,
І караблі ў цябе плывуць,
Бягуць зайцы к табе з лясоў,

Ты — паляўнічы, ты-ж і воўк.
Запяўшы станік хвартушком,
Як мама, прыбіраеш дом
І лялькам аддаеш загад,
Каб не дурэлі.
Гульняў шмат
За дзень ты можаш перабраць.
Гуляй, дзіця,— твая пара!
А я падумаў сёння аб адным:
Цяпло вясны ў табе самім.

Зірні, дзіця!
Ужо канец зімы,
Марозных кветак сон
Змялі дамы
З акон.
Хоць і гуляеш ты яшчэ у снег і вецер,
А снег ужо растаў,
Ідзе вясна па свеце,
У чаргаванні дзей,
У кругабегу дзён
Мінае час, раджаецца жыццё,
Расце жыццё, і ты расцеш, дзіця!
Шырокі прад табой адчынены прасцяг:
Ты будзеш доўга жыць — дужэць і гартавацца
У харастве вясны і ў сонцы летняй працы.

*1940*

## ДВАНАЦЦАЦЬ ГАДЗІН

Выходжу я ў поўнач на светлы прастор
Паслухаць хаду свайго краю.
У горадзе відна, — слупамі да зор
Святло ад муроў вырастае.

На плошчах нямоўчна грымяць рупары,
Дамы не сцішаюцца позна.
І толькі далёкія дрэмлюць бары,
Загойдаўшы птушак у гнёздах.

Вось зорка мільгнула і ўпала між гор,
Пражэктар абшуквае далі.
Я зрок пасылаю на промні яго,
Каб бачыць і шырай, і далей.

На Млечным шляху узгараецца бой,
І я уяўляю, што лётчык
Па ворагу ўдарыў, і падае той
Кавалкам гаручае ночы.

Куранты спакойна адзвоньваюць час.
Увага! Вось зараз дванаццаць...
І кроў пачынае імклівей гучаць,
І сэрца мацней хвалявацца.

Мелодыя гімна наўсцяж паплыла.
Узняты магутнай залевай,
Спяваем з сябрамі, і хутка зямля
Уся абдымаецца спевам.

Працоўнаю вартай растуць гарады,
Дамы нашы — поўныя соты.
Мы сёння пад гімнам раўняем рады
Для заўтрашняй спорнай работы.

*1944*

## МАЙСТРУ

Выйдзі, майстар,
У горадзе лепшае месца знайдзі
І падмурак кладзі.
Так будуй гэты дом,
Каб за кожным акном
Новы дзень разгараўся вясёлым святлом,
Каб ніхто не ўтаіў захаплення ў вачах,
Паглядзеўшы, як сонца ліецца на дах.

Ты будуй гэты дом, ды трывала будуй,
Самым лепшым цэментам пралёты змацуй,
Як спатрэбіцца медзь ці спатрэбіцца сталь, —
Іх дадуць
Украіна,
Урал,
Казахстан.
Дзверы з дубу навесь:
Гай магутных дубоў
Каля Нёмна жыве.
Уздоўж яго берагоў.
На завесы надзейныя дзверы прыбі,
Але гэтак зрабі,

Каб дзіця тыя дзверы магло адчыніць
Каб гасцінна яны
Запрашалі сяброў
Не мінаць гэты дом,
Завітаць на парог.
А па гэтай рабоце ты фарбы вазьмі
З усяе неагляднае нашай зямлі,
Каб і зоры свяцілі,
І кветкі раслі,
Каб найлепшыя колеры ў доме былі.
Расстарайся на вокны празрыстага шкла, —
Самай тонкай работы павінна быць шкло,
Каб ніводная рыска значна не была,
Каб лілося святло,
Калі сонца ўзышло,
Каб не гасла відно,
Калі зойдзе яно,
Каб марской чысцінёю паветра плыло.

Чуеш, майстар?
Старайся, як лепей зрабіць!
Пабудову закончыш,—прайдзі і агледзь,
Каб не брыдка табе было, майстар, сустрэць
Тых, што прыйдуць сюды
Гаспадарыць і жыць.
Дом гатоў і, здаецца, плыве ў далячынь,
Дзе відны ўжо наступнага берагі.
І падзякаю партыі песня гучыць,
І нястомна на вахце стаяць юнакі.

*1945*

## ШОЛАМ-АЛЕЙХЕМ

Любоўю з табою ў імкненнях мы звязаны творчых.
Хоць плакала сэрца, ды горка смяяліся вочы.

Стаю перад скарбамі кніг тваіх—праўды крыніцай,
І жудасць мінулай пары мне ізноў быццам сніцца.

Не раз суцяшалі ў бядзе твае свежыя словы
І ўверх узнімалі пахілыя ў горы галовы.

Ты радасці шмат нам прыносіў заўжды ў вечар
зімні,
На'т бацька мой хмуры — і той усміхаўся з усімі.

І слухалі Шолам-Алейхема з намі суседзі,
Жанкі, помню, шылі... Смяяліся ўсе, нібы дзеці...

А бацька стары, каб на людзях ад смеху ўхіліцца,
Паважна выходзіў на двор — зачыніць акяніцы.

Але ў тыя дні я не раз неўспадзеўкі падслухаў,
Як рогат яго праз акно далятаў да нас глуха.

У «шукальнікі золата» за акіян ты падаўся,
Але не знайшоў... Быў ты бедным—такім і застаўся.

Ў Нью-Йорку дасюль яшчэ цэлы той дом, дзе
памёр ты.
Жывуць краўцы Бронкса ў ім. Радасці горам сцёрты.

Ў тым доме і каменя нават няма з тваім імем,
Твой помнік — то кнігі. З'еднаў нас навекі ты з імі.

А ў Бронксе пастаўлен цялец залаты ў стальным
храме,
Як тупасці помнік, банкірамі і гандлярамі.

Ты скора патух, але будзеш свяціць і ў далейшым,
Ў вяках дарагім застанешся, наш Шолам-Алейхем.

Прайшлі з тваім імем праз цьму перашкод у жыцці
мы,
І скарб даняслі твой да светлай савецкай Радзімы.

І, роўныя з іншымі ў нашай сяброўскай мы хаце,
Паклалі ў скарбніцу народаў і наша багацце.

А смех твой шырокі на мовах савецкіх гучыць
гучным звонам,
І заўтра, як сёння, ўшануюць цябе векапомна.

Яшчэ маладзейшым ты будзеш у нашым далейшым,
Ў вяках дарагім застанешся, наш Шолам-Алейхем.

*1939*

## ДЗВЕ СЯСТРЫ

### (Урыўкі з паэмы)

Ідуць яны коўзкім узгоркам —
Дзяды, і матулі, і дзеткі.
І лёд на магіле той горкай
Папросіцца ў страшныя сведкі.

І сына маленькага маці
Да сэрца свайго прытуліла.
— Дачушкі мае, уцякайце
Ад немцаў, ад чорнай магілы!—

І шэпча старэйшай на вуха:
— Застанься для таты, як памяць, —
І ўпала ў знямозе, і глуха
Азвалася стогнамі замяць.

Дрантвее малы, нібы мармур,
А з вуснаў цяплынь павявае,
Яшчэ абнімае ён маму,
Яшчэ калыханкі чакае...

І Дзіна ідзе праз руіны
З малодшай сястрыцаю Галяй.

І сціснута сэрца у Дзіны,
Як Галіны вусны — ад жалю.

Ні кулі, ні смерць, ні праклёны
Спалохаць не змогуць дзяўчатак.
І сёстры ўцякаюць з калоны...
За нейкай разбуранай хатай

Схаваліся. Доўга стаялі.
Гудзеў неўгамованы вецер.
І вуліц маўклівыя далі
Ахову прыносілі дзецям.

Маленькія сёстры, як цені,
Куды іх завея пагоніць?
Далёка яшчэ вызваленне,
А ўсё-ж яно ймчыцца на конях!

* * *

Крочаць праз мяцелі,
Крочаць дзве дзяўчынкі,
Змерзлі, пасінелі —
Без гнязда птушынкі.

Дзесьці ў вёсцы дальняй —
Добрыя сяляне.
Як знайсці кірунак,
Як знайсці ратунак?

Вые злосны вецер.
І шукаюць дзеці
Цётку ці бабулю, —
Можа, хто прытуліць?

Снегам пазанесла
Ўсе шляхі-пуціны,
Сэрцу ў грудзях цесна...
Дзе святло хаціны?

На ускраі вёскі
Светлыя палоскі
Глянулі з аконца.
Можа, тут іх сонца?

Вые вецер зверам.
Стукнуць, можа, ў дзверы.
Хоць пара начная,
Хоць ніхто не знае
Гэтых дзвюх дзяўчынак —
Без гнязда птушынак.

І знаходзяць тую
Маці залатую,
Што дзяцей нямала
Ўласных гадавала.

Стогне Міхаліна:
— Ўсюды немцы-каты!
Як знайсці мясціну,
Дзе схаваць дзяўчатак?

* * *

І ў пуні, як толькі сцямнела,
Дзяцей Міхаліна хавае.
Халодныя іхнія целы,
Як маці, яна саграває.

А вецер — над дахам, над краем,
Сціскае і пальцы, і сэрца.
Паплакала трошкі-б старая, —
Лягчэй-бы ёй стала, здаецца.

І шэпча ласкавыя словы...
Усё палюбіла сялянка —
І Дзініны доўгія бровы,
І Галіны шчокі ў вяснянках.

Хто болей ёй любы і родны?
Абедзвюх заслоніць ад кулі.
Зрабіць-бы, каб злосць і нягоды
За гэтую ноч прамінулі!

І стогне пад пуняю глеба,
І дзеці скрозь сон уздыхаюць.
Чаму не з'яўляецца з неба
Рука, што зладзюг пакарае?

І моліцца ўслых Міхаліна:
— Забойцам пашлі пакаранне! —
...Праз шчыліны пуні гасціннай
Прабілася шэрае ранне.

* * *

У смерці дзесятак шляхоў, пэўна, ёсць,
Жыццё — сотні, тысячы мае.
Радзіма! Жыццёвую ўпартасць і лёс
Народ мой табе прысвячае.

Магутную зброю куюць кавалі,
Зара перамогі ірдзее.

Вы чуеце скаргі?
То скаргі зямлі,—
Ёй цяжка насіць ліхадзеяў.

Яшчэ толькі сорак другі— Беларусь
За дротам калючым, у ранах.
І лепшыя людзі ў такую пару
Ідуць у лясы, ў партызаны.

Яшчэ у пажарах і хаты й сады,
Ні хлеба няма, ні адзення.
Але над спалохам, над смерцю заўжды
Пануе людское сумленне.

Апошні кавалак старая цішком
Прынесла вандроўніцам з гета.
Спаліла-б фашысцкую погань агнём, —
Адна ў яе мара і мэта!

* * *

Думае розумам ясным,
Чуе ўсхваляваным сэрцам, —
Гэтым дзяўчаткам няшчасным
Трэба дзе-небудзь сагрэцца.

Тут — ні прытулку, ні сховы.
Немцы — ля кожнай хаціны...
Ёсць у сяленні Дуброва
Сябра старыя Міхаліны.

Трэба падацца туды ім.
Сцюжа. Вятры над палямі.
— Донькі мае залатыя,
Як развітаюся з вамі?

Разам паплакалі горка.
Хутка ці будзе спатканне?
Будзе!
А покуль за ўзгоркам
Трох пуцявін скрыжаванне.

Галя да сябра з Дубровы
Пойдзе адною пуцінай.
Ў лес партызанскі суровы
Прыйдзе сястра яе — Дзіна.

* * *

Аб сёстрах спявай, маё сэрца!
Прыйшло красавіцкае сонца,
І дождж над зямлёй пранясецца,
І гром адгукнецца ў аконцы.

Вось снегу няма ўжо,
і травы
Усходзяць ля студні вясковай,
І тысячы сонцаў ласкавых
Вада пачала адлюстроўваць.

У сне неспакойным, уночы,
Да Галі з'яўляецца мама;
Як цяжка па снезе ёй крочыць,
Па коўзкіх руінах і ямах!..

У мамы разбітыя скроні...
О мама, чаму ты нямая?
І падае Галя ў бяздонне,
За што затрымацца не мае.

Сцюдзёныя сцены навокал
Адточаны гладка...
І раптам
Ёй робіцца цёпла і лёгка,
Хтось Галю паціху пакратаў.

У хлеве — цыляты малыя,
Тут цёпла ад іхняга пару.
Дзве мяккія, гладкія шыі
Ля Галінай шыі і твару.

Сябры дарагія, цяляты,
Пастушку маю беражыце,
Бо могуць фашысцкія каты
Прыйсці і да вас...
Не кажыце,

Што Галя прыйшла мая з гета,
Ёй крыжык наўмысля надзелі.
Няхай гэта будзе сакрэтам,
Каб немец яе не застрэліў!

* * *

Вайна. Папялішчы — не хаты...
І лета ў крывавых праменнях...
На лузе нямыя цяляты
Глядзяць на маланкі ў здзіўленні.

І пахне травой сакавітай,
І шэпча трава тая ціха:
— Галіна, цялят беражы ты,
Інакш будзе ліха! —

Так, ёсць гаспадар у цяляці,
А Галя адна ў гэтым полі..
На фронце татуля,
а маці...
Не прыйдзе ніколі, ніколі!

На вёрсты, на цэлыя мілі
Палі працягнуліся ўдалеч,
І кветкі галовы схілілі,
Ласкава ўсміхаюцца Галі.

... Праз буры і ўранку і ў змроку
Імчыць яе тата здалёку,
І Галю ён вызваліць першы...
Ён прыйдзе ці конна, ці пешшу!

На крыллях ляціць яе тата,
А можа, на шумных гарматах,
І гэткіх, як тата, нямала,—
Іх тысячы — воінаў дбалых!

* * *

Дуброва. Пустэльны куток Беларусі.
Уздрыгвае лісце на белай бярозе,
Тугу і самоту выстуквае бусел,
Гаворыць на мове сваёй у трывозе.

Ноч. Хаты сляпымі, як цемра, вачамі
Глядзяць у прастор, што не мае і краю,
І хлопцы з лясоў, нібы цені, часамі
Таемна прыходзяць, таемна знікаюць.

...Сядзіць у куточку на лаўцы бабуля.
Лучына даўно ўжо сатлела і згасла.

І ціха, — каб немцы, крый божа, не чулі, —
У бойцы употайкі б'е яна масла.

А Галя ляжыць. Ёй не спіцца, не спіцца,
Гарыць яе цела, а вочы — у скрусе.
Спаўзла яна з ложка і падае ніцма
Прад бабкай старою:
— Баюся, баюся!

О добрая бабка, скажу табе сёння
Ўсю праўду. Ты-ж толькі нікому ні слова! —
Спужалася баба:
— Што кажаш ты, доня?
Ты трызніш, дзяўчынка.
Ды ты нездарова! —

А Галя ў пакуце разгублена шэпча,
І літасці просяць засмяглыя вусны.
Яе абнімае старая за плечы:
— Ну што-ж ты трапечаш? —
— Баюся, баюся...

Скажу я ўсю праўду. Дзяўчынка я з гета. —
І слёзы ў вялізных вачах задрыжэлі:
— Баюся, дазнаецца немец пра гэта,
Баюся, каб немец мяне не застрэліў.

А бабка пяшчотна яе прытуліла
І гладзіць, як маці, малую дзяўчынку.
— Хай згінуць фашысты — нячыстая сіла!
Не бойся. Я ў горы цябе не пакіну.

* * *

Сяло ў Беларусі — Дуброва.
На полі — духмянае лета.
Там пасвіць, пільнуе каровы
Дзяўчынка маленькая з гета.

Спалох і самота над краем,
Разбураны ён ад напасці,
Няўжо, Беларусь дарагая,
Тваё зацямнілася шчасце?

Дзяўчынку-ж усе палюбілі!
Скарынку апошнюю з ёю
Вясковыя людзі дзялілі,
Бо ў сэрцы — сумленне святое.

Яно ў барацьбе, ў небяспеках
Сагрэе нязгасным праменнем,
Яно зберажэ чалавека,
Яно прынясе вызваленне.

II

Наследвала Дзіна дзядулевы вочы,
А воблік пазычыла ў мамы:
Як тая,
І плаўна, і лёганька крочыць
І ўсмешкаю свеціць таксама.

Яе хараство яшчэ покуль схавана,
І толькі ў вачах яно ўсходзіць.
Як сонца, закрытае ўранні туманам,
Да Дзіны юнацтва прыходзіць.

Радзіма з калыскі яе гадавала,
Рукою дзявочаю, чыстай,

Рукою, што кволыя краскі збірала,—
Сама задушыла-б фашыста!

Прыйшоў снегавою парой і пагнаў ён
На вісельню дзеда.
А Дзіна
Да шыбы прыпала і ўслых застагнала...
Адпомсціць унучка павінна!

* * *

Глядзіць гэты лес старажытным палацам,
Карэнні, як быццам слупы выразныя,
Сняжынкі, нібы дыяменты, іскрацца.
Як грэбні, галіны ялін ільдзяныя.

Страшней ад звяроў і дрымучага бору
Той жах, што дзявочае сэрца параніў.
Прад ёю — далёкі заснежаны ўзгорак,
І маткі, і дзеці ў даўгім пахаванні.

Стамілася Дзіна, прысела на момант.
І вочы яе замыкае дрымота.
Нара пад ялінай здалася ёй домам.
У лісці замшэлым заснуць ёй ахвота...

* * *

Палаў эшалон на зары,
Палохаў разбуджаных птахаў,
І вогненны, вольны парыў
Гуляў па вагонах, па дахах.

І дым апускаўся на дол,
Панурыя вораны грозна

Разносілі вестку наўкол:
— Пагроза, пагроза, пагроза!

І нават да ціхай нары,
Дзе сон над усім уладарыў,
З вятрамі дайшлі на зары
І водблеск, і дым ад пажару.

Ей душна...
Чыясьці спіна
Святло засланяе ад Дзіны.
Яна не адна, не адна!
І нехта глядзіць на дзяўчыну.

Ён дыхае цяжка.
І кроў
На твары юнацкім і светлым.
Ён шэпча:
— З якіх ты краёў?
Быць можа, ты з гета? —

Ён бачыць збянтэжаны твар.
Жалобныя, цёмныя бровы.
— За смерць, за пакуты ахвяр
Я помсціў сурова.—

І Дзіна палоскі ірве
З дзявочай кашулі старанна,
На русай яго галаве
Яна перавязвае раны.

Схілілася Дзіна над ім.
Здаецца, у сне ён з'явіўся.
А водсвет пажару зусім
З праменнямі першымі зліўся.

І ранак празрыстым святлом
Пакрыў снегавое раздолле.
Дзесь заяц шмыгнуў за ствалом...
Ідуць яны разам паволі.

Ён кажа, што блізка атрад...
Што зробіш? Ён крочыць-бы рад —
Ды толькі ў вачах пацямнела.
Цяжэе ягонае цела.

У лесе ёсць вуха, заўжды
Яно прыслухаецца ўпарта.
Са зброяй прыбеглі сюды
Хлапцы з партызанскае варты.

А сосны струменілі пах,
І лес напяваў яму песні.
Хлапцы на сваіх кажухах
Яго да зямлянкі панеслі.

Іх добрых вачэй цеплыня
І сэрца дружбацкая сіла
Яго да жыцця абудзіла
На ўсходзе наступнага дня.

* * *

Дабру невядомы ні стома, ні жах,
Ідзе яно шляхам уласным
Па свеце,
Хаця і цярністы той шлях,
Але ён магутны і ясны.

Благога ў жыцці не зрабіла дзіця,
З дабром яе зліты імкненні.
З бяды я выношу яе, нібы сцяг,
У светлыя дні вызвалення.

Мінае зіма, і вятры ўжо не дзьмуць,
Загояцца раны краіны.
Няхай пакаленні аповесць складуць
Аб справах сумленных дзяўчыны.

* * *

На небе вячэрняя ўсходзіць зара
І кліча ў паход партызанаў.
У лесе старым застаецца сястра,
І сэрца яе ўсхвалявана.

Няхай ім не выпадзе стрэцца з бядой,
Хай вернуцца цэлымі людзі.
Смалістыя сосны гамоняць над ёй,
І льецца іх водар у грудзі.

Яна ўжо не можа без справы сядзець,
І пальцы смуткуюць па нечым.
У бой захацелася ёй паляцець,
Яна ў непакоі трапеча.

От коннік імчыцца. Хрыпіць яго конь,—
У пене, у мыле нясецца.
У конніка ў чырвані левая скронь;
І Дзіна зрываецца з месца.

І конніка хутка знімае з сядла,
Нясе да лясное хаціны,

Ён дыхае ледзьве.
Ёсць іскра цяпла, —
І значыць ён выжыве ў Дзіны!

* * *

Светлыя снапы на трактах,
Танкі ў Мінску — свята час!
Ззяюць жэрламі гарматы,
Вечна будзе светла ў нас!

Лета ходзіць па Дуброве,
Жыта спее на палях.
Бацька твой, жывы-здаровы,
Да цябе трымае шлях.

Партызаны на дарогах, —
Колькі воінаў-салдат!
Ад малога да старога —
Ўся краіна выйшла з хат.

У натоўпе — Міхаліна,
Як у моры хваль жывых.
А каго спаткаць павінна?
Пэўна, ўжо дзяцей сваіх!

Галава — у хустцы белай,
Хустка ў сонцы стала ззяць.
Цела ўсё памаладзела,
Ногі просяцца скакаць.


Хоць гадамі твар прымяты,—
Дабрата-ж на ім відна.
Між штандараў, горда ўзнятых,
Ўсё вышуквае яна.

Ці не сон?

Пазнала ледзьве,—
Гэта Дзіна на кані!
Хто вучыў дзяўчыну ездзіць,
Меч трымаць у вышыні?

У руках не меч — вінтоўка!
Сонца блытае заўжды.
Глянь, як хараша і лоўка
Нацягнула павады!

Прыгадалі тое ранне,
Як дарогі замяло,
Гаварылі: — Да спаткання!—
Развітання-ж не было!



## *АЙЗІК ПЛАТНЕР*

Старэйшы яўрэйскі паэт Айзік (Ісак Хаімавіч) Платнер нарадзіўся ў 1895 годзе ў былой Сядлецкай губерні ў г. Сакалоў-Падляскі ў сям'і краўца. Працоўная дзейнасць А. Платнера пачалася вельмі рана. Некаторы час ён жыў у розных гарадах Літвы і прымаў удзел у рабочым руху. У пачатку 1921 года выехаў у ЗША. У 1932 годзе вярнуўся ў СССР, жыў у Мінску, актыўна супрацоўнічаў у перыядычным друку.

Вершы А. Платнер пачаў друкаваць у 1919 годзе. Першая кніжка «Аб чым дзень апавядае» выйшла ў 1930 годзе ў Н'ю-Йорку. У 1935 годзе ў Мінску выйшла асобнай кнігай яго «Паэма аб краўцах», у 1940 годзе — «Сонца на парозе», у 1947 годзе — «З любоўю і верай», у 1948 годзе — «Самае дарагое» і шэраг іншых кніг. Вершы А. Платнера неаднаразова перакладаліся на рускую і беларускую мовы. У зборнік «Соль жыцця» ўвайшлі лепшыя паэтычныя творы А. Платнера ў перакладзе на беларускую мову.

## З М Е С Т


Соль жыцця. *Пераклад П. Глебкі* . . . . . 5
Крыніца. *Пераклад М. Хведаровіча* . . . . 8
У дарозе. *Пераклад А. Вольскага* . . . . . 10
Мая ўрачыстасць. *Пераклад А. Звонака* . . . 12
У раі. *Пераклад М. Хведаровіча* . . . . . 14
У лесе ў пачатку вясны. *Пераклад М. Хведаровіча* 16
Нясканчаны аўтапартрэт. *Пераклад М. Лужаніна* 18
Дружба. *Пераклад М. Хведаровіча* . . . . 21
Чалавечае слова. *Пераклад А. Звонака* . . . 22
Бабіна лета. *Пераклад М. Хведаровіча* . . . 23
Героям паўстання Варшаўскага гета. *Пераклад А. Звонака* . . . . . . . . . . 24
Песня радасці. *Пераклад А. Звонака* . . . . 26
Каменне маёй вуліцы. *Пераклад А. Звонака* . . 28
Памяці комсамольца. *Пераклад А. Звонака* . . 30
Світанне. *Пераклад П. Глебкі* . . . . . . 33
Жыццё маё. *Пераклад П. Глебкі* . . . . . 34
Калі ласка. *Пераклад М. Лужаніна* . . . . 36
Песня пра Мінск. *Пераклад П. Глебкі* . . . 38
Да музыкі. *Пераклад П. Глебкі* . . . . . 40

Певень на маёй вуліцы. *Пераклад П. Глебкі* . . 42
Зялёны ліст. *Пераклад П. Глебкі* . . . . . . 44
Жніво. *Пераклад М. Лужаніна* . . . . . . 46
Студзень. *Пераклад М. Лужаніна* . . . . . . 48
Дождж. *Пераклад М. Лужаніна* . . . . . . 50
Кравец. *Пераклад М.* Лужаніна . . . . . . 51
Памяці Элі Кагана. *Пераклад П. Глебкі* . . 53
Не спагадай. *Пераклад М. Лужаніна* . . . 56
Працаваў цалюткі дзень я... *Пераклад Н. Чарнушэвіча* . . . . . . . . . . . . . 58
Зірні, дзіця! *Пераклад М. Лужаніна* . . . . 60
Дванаццаць гадзін. *Пераклад М. Лужаніна* . . 62
Майстру. *Пераклад М. Лужаніна* . . . . . . 64
Шолам-Алейхем. *Пераклад Н. Чарнушэвіча* . . 66
Дзве сястры (урыўкі з паэмы). *Пераклад Э. Агняцвет* . . . . . . . . . . . . 68

---

Рэдактар *М. Хведаровіч*
Мастак *Ц. Кіпніс*
Тэхнічны рэдактар *Я. Карпіновіч*
Карэктар *Г. Славінская*
*
АТ 02400. Падп. да друку 5/XI 1957 г.
Тыраж 4000 экз. Фармат 70 × 92/32.
Фіз. друк. арк. 2.75. Ум. друк. арк. 3,21
Уч.-выд. арк. 2,18 + 1 уклейка.
Зак. 546. Цана 2 руб. 15 кап.
Друкарня імя Сталіна, Мінск,
праспект імя Сталіна, 105.

На белорусском языке

*Исаак Хаимович Платнер*

**Соль жизни**

Государственное издательство БССР
Минск 1957